Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 4 (597). **Wilnia, Niadziela 27 Studzienia 1935 h.** **Hod XI (XIX).**

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Рэлігія ў абноўленай БХД.

(Артыкул дыскусыйны).

У вадным з папярэдніх нумароў «Бел. Крыніцы» тэорэтычна і практычна парушыў я справу школы ў праграме абноўленай БХД. Цяпер хачу закрануць такім-жа спосабам справу рэлігіі. І гэтую справу пастараюся прадставіць з пункту гледжаньня найбольш шырокага, агульнага і прынцыповага. Гэта знача, што справу рэлігіі ў праграме абноўленай БХД пастараемся ўняць так, як гэтага вымагае справядлівасьць і карысьць беларускага народу з пункту гледжаньня яго незалежніцкіх дзяржаўніцкіх ідэалаў.

Як палітычна-дзяржаўніцкая навука, так і палітыка практычная ведаюць сяньня, агулам кажучы, тры галоўныя спосабы адносінаў сьвецкай улады да рэлігіі.

1. **Рэлігія — гэта служка сьвецкай улады.** Пры гэткай сыстэме адносінаў рэлігія свой аўторытэт і свае ідэалы падпарадкавае народу ці дзяржаве, як найвышэйшаму аўторытэту і найвышэйшаму дабру. Пры гэткіх узаемных адносінах між рэлігіяй і ўладай сьвецкай, рэлігія, зьяўляючыся фактычна і праўна адказнай за палітыку дзяржавы, ня можа гэтай палітыкі ані крытыкаваць, ані ганіць, а толькі можа пакрываць яе, нават тады, калі яна яўна ёсьць нягоднай і несправядлівай.

Клясычным прыкладам гэткай залежнасьці рэлігіі ад сьвецкай улады была царская Расея. Вынікі для народу з гэткага палажэньня там рэлігіі дужа сумныя: упала царская Расея, разам з ёй упала і Царква, наступіла духовая анархія і ўрэшце прышло нявольніцтва, як духовае, так і фізычнае.

2. **Рэлігія — прыватная справа.** Пры гэткай сыстэме адносінаў між рэлігіяй і сьвецкай уладай звычайна ёсьць так званае аддзяленьне рэлігіі ад дзяржавы. Сутнасьць гэткага аддзяленьня ў тым, што дзяржава ў публічна-грамадзкім жыцьці сваім не прызнае ніякай рэлігіі. У дзяржаве, пры гэткай яе рэлігійнай палітыцы, няма рэлігіі ў школе, няма рэлігійнай прысягі ў судзе, не прызнаюцца рэлігійныя жанімствы і г. д. У практыцы аддзяленьне рэлігіі ад дзяржавы звычайна канчыцца прасьледам рэлігіі сьвецкай уладай.

Клясычным прыкладам гэтага была Францыя пасьля рэвалюцыі, а яшчэ клясычнейшым прыкладам ёсьць сучасная СССР. Вынікам гэткай палітыкі, можа яшчэ больш як у першым выпадку, зьяўляецца ўпадак усякага аўторытэту, расклад духова-маральны, культ сілы, і, як у СССР, — нявольніцтва грамадзян і народу.

3. **Між уладай сьвецкай і духоўнай існуе разьдзел функцыяў, дзейнасьці.** Сутнасьць гэткага разьдзелу ці лепш падзелу функцыяў у тым, што дзяржава прызнае аўторытэт рэлігіі, а рэлігія аўторытэт дзяржавы, але як дзяржава ня ўмешваецца ў справы рэлігіі, так рэлігія ня ўмешваецца ў справы дзяржавы. Усімі сьвецкімі справамі кіруе ўлада сьвецкая, а справамі рэлігійнымі кіруе ўлада духоўная. Пры гэткіх адносінах між дзяржавай і рэлігіяй няма выкарыстваньня рэлігіі для палітычных, часта немаральных мэтаў улады сьвецкай, няма ўлажаньня рэлігіі ў чужыя сабе сьвецкія справы, няма такжа ніштэньня і прасьледу рэлігіі і рэлігійнай маральнасьці.

Пры гэткай сыстэме адносінаў між дзяржавай і рэлігіяй ёсьць прынцып: супольнымі сіламі да супольнай мэты, да служэньня дабру ўсіх грамадзкіх клясаў і ўсяго народу.

Праўда, гэткая сыстэма ў палітыцы яшчэ маладая, але яна ў Эўропе пачынае ўжо штораз больш прымацца ў розных дзяржавах. На падобных прынцыпах справа адносінаў між дзяржавай і рэлігіяй вырашана ў Італіі, у Літве, Аўстрыі, на падобных вырашаецца яшчэ ў Нямеччыне і — што найдзіўней — у кірунку не ўзаемнага выкарыстваньня, ці барацьбы, але ў кірунку супрацоўніцтва для агульнага дабра — ёсьць імкненьне ў гэтай справе ў дзяржавах, дзе фармальна праведзена аддзяленьне рэлігіі ад дзяржавы, як у Францыі, у Злуч. Ст. Амэрыкі і ў іншых.

Я высказваюся проціў пагляду ў першым пункце і ў другім, а за пагляд у пункце трэцім. Беларускі народ надта дорага заплаціў і плаце цяпер, як за вынікі выкарыстваньня рэлігіі дзяржавай для палітыкі, так і за выгнаньне рэлігіі з дзяржаўна-грамадзкага жыцьця і за прасьледваньне яе. Не забываймо, што калі гаворым аб рэлігіі беларускага народу, дык фактычна гаворым аб тых беларускіх народных масах, якія вызнаюць рэлігію і што кожнае выкарыстваньне рэлігіі для мэтаў палітычных ці звычайная барацьба з рэлігіяй і прасьледваньне яе, беспасрэдна датыча самога народу і ўсім сваім, часта грозным, цяжарам звальваецца на жыцьцё яго.

Пры гэтым не забываймо так-жа, што рэлігія — гэта вялікая ў народзе цэннасьць і што калі бачым часта зло, маючае лучнасьць з рэлігіяй, дык тут справа не ў рэлігіі, а ў фальшывым яе палажэньні, у надужываньні з таго, ці іншага боку.

Прынцып супрацоўніцтва і солідарнасьці, як у іншых галінах жыцьця, так і ў галіне узаемных адносінаў між рэлігіяй і сьвецкай уладай павінен мець сапраўды вялікае застасаваньне ў нашым народзе беларускім. Вялікае разьяднаньне, якое бачым у беларускім народзе, вынікае бадай прадусім з разьяднаньня рэлігійнага, з падзелу нашага народу на праваслаўных і каталікоў і з пастаяннага падтрымліваньня і паглыбляньня гэнага падзелу нашымі ворагамі. Ужо вялікі час з гэтым скончыць. Дзьве беларускія гістарычныя рэлігіі — праваслаўная і каталіцкая — павінны, у рамках сваей компэтэнцыі, працаваць для дабра сваіх верных і, як такія, павінны ў народзе ці дзяржаве карыстацца свабодай, падтрыманьнем і пашанай. Так-жа павінны мець свабоду і пашану ў сваей компэтэнцыі і іншыя рэлігіі нацыянальных меншасьцяў на Беларусі, як стараверaў, жыдоў, магамэтан. Мусім урэшце памятаць, што праўдзівая свабода — гэта найважнейшы варунак правільнага функцыянаваньня, як рэлігіі, так і дзяржавы і найважнейшы варунак правільнай, карыснай для народу, разьвязкі адносінаў між уладай сьвецкай і духоўнай.

На аснове вышэйсказанага прапаную ў праграму абноўленай БХД уставіць наступныя пункты.

§ 1. Свабода існаваньня рэлігіі і свабода вызнаваньня.

§ 2. Проціў выкарыстваньня рэлігіі палітыкай і проціў надужываньня духавенствам палітыкі.

§ 3. За супрацоўніцтва ўлады сьвецкай і ўлады духойнай, кожнай у рамках сваей компэтэнцыі, для агульнага грамадзкага дабра.

§ 4. Рэлігійныя ўстановы ў сваей рэлігійнай працы, як у сьвятынях, школах і інш., карыстаюцца роднай мовай сваіх верных.

А. Б—ч.

„БЕЛАРУСКАЙ КРЫНІЦЫ“

(З нагоды 19-га году яе выданьня).

Ты, „Беларуская Крыніца“,
Адна з праўдзівейшых газэт!
Ад шчырых слоў душы крывіцкай,
Прымі пясьнярскі мой прывет!

Ты — найстарэйшая газэта!
Бо дзевятнаццаты ўжо год
Праз цемру зла да Праўды сьвету
Вядзеш працоўны наш Народ.

Ты — сьветач — зорка новай эры;
Народнай Волі — зорны шлях...
Ты — сымболь ходаньня і веры —
У лепшу будучыню — Гмах...

Ты ўсьцяж йдучы да сьветлай мэты
Сьмяротным ворагам на страх,
Трымаеш горда перад сьветам
Наш бел-чырвона-белы сьцяг.

Ты — Дух народнага імкненьня!
Што магутнее з году ў год.
Да Волі, Шчасьця й Адраджэньня
Заспаны будзіш Ты Народ.

Дык з гора, з крыўдаў і цярпеньняў,
Пакутны Край наш вызваляй!
Для славы прышлых пакаленьняў
Свой Новы Год распачынай!

Алесь Мілюць.

Скорычы, 10.I.1935.

Z hazet.

Sanacyjny „Родны Край“ za maskaloŭ i polonizacyju carkwy.

U Nr. 2 sioletniaha „Роднага Краю“ maładaja sanacyja — Astroŭskaha „łahieru“ — wykazwaje „swajo“ wialikaje niezdawaleńnie, što my ŭ „Biełaruskaj Krynicy“ častawata pišam ab relihijna-carkoŭnym žyćci. Hetym maładym „białorusinom-polakom“ asabliwa nie spadabałasia našaje apošniaje wystupleńnie prociŭ maskaloŭ, jakija nadta raspalitykawalisia ŭ našym kraju i trebujuć užo ŭwiadzieńnia ŭ carkwu polskaj mowy, i ahułam, nie ŭspadabali astroŭščyki, što my wystupajem prociŭ uwiadzieńnia ŭ carkwu polščyny.

Pry hetym, jany wykazali „swajo“ niezdawaleńnie i z abnowy BChD.

Woś-ža i z hetkaj apinii „Роднага Краю“ my ŭpeŭniajemsia, što linija našaja prawilnaja, bo kali-b jana była dobraj dla „białorusinuw-polakuw“, to napeŭna była-b zhubnaj dla biełaruskaj sprawy.

„Kurczy się polskość“.

Polskaja hazeta „Piast“ pad hetkim zahałoŭkam piša: „Paśla 1920 h. chwala sialan płyła z Zachadu na Uschod. Asiadali na dwornaj ziamli. Zdawałasia, što heta naturalnaje źjawišča, jakoje pakrywajecca z najważniejšymi intaresami dziaržawy. Tymčasam, ciapier źjaŭlajemsia świedkami pracesu adwarotnaha: sialanie waročajucca z Uschodu na Zachad“...

My biadawać nie źbirajemsia, što na „Uschodzie“ (na biełaruskich i ŭkrainskich ziemlach) korčycca polščyna, ale hetaje źjawišča pakazwaje, što našaje sialanstwa wielmi „skorčanaje“ na niewialičkich haspadaračkach i dziela hetaha wyciskaje prybyšoŭ.

p.

Z dziejnaści Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury.

Lachawičy, Baranawickaha paw. Dnia 12 studnia 1935 h. adbyŭsia ahulny schod siabroŭ Lachawickaha hurtka B.I.H.iK. z takim paradkam dnia:

1) Adkryćcio schodu, 2) wybary prezydyjumu schodu, 3) sprawazdača ŭradu za minuły 1934 h., 4) składki siabroŭskija na 1935 h., 5) sprawa biblijateki, 6) pierawybary ŭradu hurtka i 7) biahučyja sprawy.

Da p. 1 i 2. Staršynia adkryŭ schod roŭna a 5 hadzinie pa paŭdni i zaprapanawaŭ na staršyniu siańniašniaha schodu Felika Zielanieŭskaha, što adnahałosna pryniata, a na sekretara sabraŭšymisia byŭ zaprošany siabra J. Jurlewič.

Da p. 3. J. Čarnecki — staršynia Uradu hurtka — zdaŭ sprawazdaču z dziejnaści hurtka za minuły 1934 h., z katoraje widać, što ŭsia praca Uradu hurtka ŭ minułym hodzie była wiedziena ŭ kirunku załažeńnia ŭ Lachawičach kooperatywy, u pieršuju čarhu małačarskaje. Dziela hetaha było sklikana, z inicyjatywy uradu hurtka, 6 ahulnych schodaŭ usich ziemlarobaŭ žycharaŭ Lachawič i blizkich wakolic. Na schodach wyjaśnialisia mety i zadańni kooperacyi naahuł, a małačarskaje asabliwa. Jak rezultat hetaha było pastanoŭlena załažyć u Lachawičach małačarniu i ŭžo wybrana była Nahladnaja Rada i Urad małačarni, kudy ŭwajšli ludzi z miascowaje intelihiencyi, duchawienstwa, ziemlarobaŭ i čynawiectwa, biaz rožnicy nacyjanalnaha pachodžańnia. I woś, nia hledziačy na hetaki skład Nahladnaje Rady i Uradu, a tak-ža nia hledziačy na ŭłožanuju ŭ heta pracu (było źniata pamieškańnie i nawožany i ŭłožany lod i byli sabranyja siabroŭskija składki) małačarni ŭsio-ž taki nia sudžana było pajšci ŭ chod, a hetamu na pieraškodzie stali niekatoryja adzinki z miascowaha B. B., słabaje zrazumieńnie sprawy praz ahuł ziemlarobaŭ, słabaja enerhija Nahladnaje rady i Uradu i zapawiedź Baranawickaha starasty, katory zajawiŭ ks. M. Ikanowiču, staršyni Nahladnaje Rady, što kali J. Čarnecki (staršynia hurtka Instytutu) budzie naležać da ŭradu małačarni, to starasta budzie rabić usialakija ŭtrudnieńni hetaj małačarni, a napaśledak aryšt J. Čarneckaha na 5 dzion pierad tym, jak mieŭsia Urad jechać pa małačarskija mašyny i pryłady, a biez Čarneckaha nichto z Rady i Uradu arhanizawanaje małačarni ni ab čym nie parupiŭsia.

Pasiedžańniaŭ Uradu hurtka ŭ 1934 h. było 3, a ahulnych schodaŭ 2. Wysłuchaŭšy sprawazdaču i pryniaŭšy jaje da wiedama, ahulny schod paśla dyskusyi pastanawiŭ u 1935 h. z bolšaju enerhijaj pačać šyryć siarod narodu świedamaść ab patrebie kooperacyi i naahuł samapomačy ŭ haspadarčym žyćci i kali zdarycca mahčymaść, to iści da zakładańnia swaich wytworčych i tarhowych supałak.

Da p. 4. Abawiazkowyja siabroŭskija składki ŭchwalena na 1935 h., tak, jak pradbačana ŭ statucie: 1 zł. upisnych i 1 zł. siabroŭskich, pry hetym, chto z dasiulešnich siabroŭ da 1 lutaha s. h. nie ŭniasie składki, abo nie zajawie Uradu hurtka, kali składka budzie ŭrehulawana, toj z hetaha času pierastaje być siabram hurtka, bo siabry, katoryja ŭ pracy hurtka nie biaruć nijakaha ŭdziełu, susim niepažadanyja.

Da p. 5. U sprawie biblijateki — akančalna pastanoŭlena adkryć biblijateku. Na biblijatekara wybrany siabra Aŭhustyn Sienkiewič, a na zastupnika — siabra Dziamjan Jurlewič, katorym daručana ŭ praciahu tydnia ŭparadkawać knižki, zrabić šafu i, paśla lokalizacyi biblijateki, što-tydnia ŭ subotu wydawać i mianiać knižki, jak siabrom tak i nie siabrom, pryčym nie siabry, katoryja buduć karystacca z biblijateki, musiać unasić apłatu za karystańnie i ŭstanoŭleny Uradam hurtka załoh.

Pry hetym pastanoŭlena źwiarnucca da hramadzianstwa z prośbaju achwiarawać, chto jakija maje, karysnyja knižki dla biblijateki hurtka.

Da p. 6. Urad hurtka wybrany ŭ nastupnym składzie: Jan Čarnecki — staršynia, Feliks Zielanieŭski — zastupnik staršyni, Mikałaj Jefimčyk — sekratar, Jan Lisoŭski — zastupnik sekratara i Stanisłaŭ Zielanieŭski — skarbnik.

Da p. 7. Pastanoŭlena źbiracca kožnuju subotu a 5 hadz. wiečaram u kwatery hurtka, kab supolna čytać knižki i hazety. Daručana sekrataru hurtka źbirać pa 1 ekzemp. biełaruskich hazet i sšywać hadawiki hazet. Kožny siabra pawodle mahčymaści pawinien staracca pabolšyć lik siabroŭ hurtka. U mieru napływu siabroŭskich składak, u pieršuju čarhu rehulawać naležnaść za litaraturu, hazety; pakryć doŭh hurtka ŭ Centrali BIHiK i abawaročwać na patreby i pašyreńnie biblijateki hurtka. Pieršaje pasiedžańnie nowawybranaha Uradu hurtka naznačana na 15 studnia s. h. na 5 hadz. pa paŭdni ŭ kwatery hurtka. Na hetym ahulny schod pry śpiewie himnu Instytutu „Dzie čutny mowy našaj huki“ zakryty.

Nowyja hurtki B. Inst. H. i K. Załažylisia dwa nowyja hurtki BIHiK u Nawahradzkim pawiecie: u wioscy Wiarašyčy, Pačapaŭskaj woł. Zakładčyki — Mikałaj Aniščyk, Mikałaj Čartko i Uładzimier Hančaruk, i ŭ w. Mondzin, Rajčanskaje woł. Zakładčyki — Nadzieja Karataj, Arsień Karaś i Pawał Aniščyk. Abodwa hurtki lehalizujucca ŭ Nawahradzkim starastwie, jakoje wielmi niaprychilna adnosicca da paŭstawańnia nowych hurtkoŭ. Apošnim časam nie zarejestrawała hurtka ŭ Delatyčach.

ГРАМАДЗЯНЕ! Усе на ніву культуры! Гдзе няма, — арганізуйце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, а гдзе ўжо заложаныя — узмоцніце ў іх працу!

Латвійская процібеларуская тактыка.

Ведама ўжо чытачам „Беларускай Крыніцы“, што ў выніку жорсткага процібеларускага курсу, шмат беларускіх школ у Латвіі летась зачынена, або далучана да школ латвійскіх, а працуючыя ў іх вучыцялі апынуліся бяз працы.

Аднак апошнім часам заўважываецца „зьмена“ гэнага курсу ці лепш — зьмена тактыкі. Вось факты. З зачыненых беларускіх пачаткавых школ на вёсцы, некаторыя ўзноў ужо працуюць; таксама прыняты назад у большасьці беларускія вучыцялі; некаторыя з вучыцялёў сапраўды пацярпелі — так, што і цяпер ня могуць знайсьці ніякай працы.

Ясна, што запачаткаваныя латышамі „залёты“ да беларусаў ня маюць шчырых асноў. Яны хочуць знайсьці шлях, як лепш павялічыць свае рады коштам беларусаў.

У нумары 64 (ад 29.X.34.) выходзячага ў Рызе часапісу „Rits“ зьмешчаны артыкул п. з. „У Дзьвінску новы твар“, у якім паміж іншым чытаем вось што:

„У Дзьвінску заўважана зьявішча, што зараз апалячаныя і абеларушчаныя латышы (sic!) шукаюць шляху звароту ў сям'ю латышоў. Вялікае значэньне дзеля гэтай справы маюць школы агульнага дэпартаманту, гдзе домінуе латыскае. У гэтыя школы і накіроўваецца большасьць тых, што раней лічылі сябе чужынцамі(!)“...

Ды мала гэтага. Латышы так ухапіліся за ідэю школ агульнага дэпартаманту і за „залёты“ з беларусамі, што гэную ідэю і „залёты“ праводзяць „спагадна-суседзкім“ спосабам, іменна стараючыся адчыняць школы агульнага дэпартаманту, там, гдзе месьцяцца ўжо беларускія школы. Напр. зараз на Чырвонай Дзьвіне ў Рызе ў тымжа нумары думу, гдзе знаходзіцца II беларуская пачаткавая школа, вячэрняя школа для дарослых (пачаткавая) і беларуская дадатковая школа (адзіная ў Рызе) латышы задумалі адчыніць пачаткавую школу агульнага дэпартаманту. Дзеля навучаньня польскае мовы запрасілі аднаго з вучыцялёў бел. школ М. Дзямідава. Беларускае мовы яшчэ няма, бо... мала вучняў (і наагул там мала вучняў). У кожным выпадку — польскі лектар — беларус I можа здарыцца, што дзякуючы суседзтву (месьцяцца школы ў адным будынку!), ды пабачыўшы свайго былага вучыцеля нехта з вучняў беларускіх школ і заблудзіць — і пападзе ў дзьверы не сваей беларускай школы, а ў дзьверы школы агульнага дэпартаманту. I вось, каб дагадзіць латвійскім уладам, гр. Дзямідаў шчыра працуе на іх карысьць, агітуючы, каб дзеці з беларускай школы пераходзілі туды. Гдзе толькі словамі ня можна пераканаць, там ідзе на дапамогу і фляшка гарэлкі. — Зараз ужо дзякуючы гэткім ягоным „шчырым стараньням“ 5 вучняў-беларусаў з беларускай пачаткавай школы выступілі і перайшлі ў новаадчыненую школу агульнага д-ту. Гр. Дзямідаў гэтым яшчэ не абмяжаваўся і далей стараецца „ўслужываць“ латышам.

Ізноў-жа ў Прыдруйску існуе — ужо аддаўна — школа пачаткавая агульнага дэпартаманту. Дзецям беларусам забаронена і падчас пераменаў гутарыць інакш, як толькі палатыску. У школе дзецям кажуць запісываць нацыянальнасьць такую, на якой мове гутараць.

Здаецца зьявішча дадатняе. Але, дзеля таго, што некаторыя з беларускіх дзетак дзеля нясьведамасьці — хочуць запісацца „палякамі“ ці „расейцамі“, — робіцца „уступка“: ім — маленькім дзецям, — што ў нацыянальнасьці разьбіраюцца ня менш, як іх бацькі ў кітайскай мове, дазваляецца, замест беларусамі — пісацца латышамі.

З гэтага і выходзе, што ў школе большасьць вучняў па нацыянальнасьці... „латышы“, бацькі якіх нават ня ўсе чулі латыскую мову, не ўяўляюць, што яна з сябе прадстаўляе.

I такім шляхам „зварачываюць“ беларусаў у латышы, няраз пры помачы нягодных служак з боку нібы беларусаў.

Чаго ня ўздумае дзікі латвійскі нацыяналізм! Верым аднак, што латвійская процібеларуская тактыка не аслабіць беларускае справы ў Латвіі, — наадварот — узмоцніць яе значна!

Задзьвінскі.

Дзьвінск.

Wałasnyja ŭłady ŭ Drui nie pryznajuć polskich dziaržaŭnych zakonaŭ.

Jość u Polščy h. zw. „jazykowy zakon“. Wydany jon 31 lipnia 1924 h. i ad taje pary jość abawiazwajučy. Hety zakon kaža, što na terytoryi Wilenščyny, Nawahradčyny i Horadzienščyny — wa ŭsiej Zach. Biełarusi — polskija ŭłady administracyjnyja, samaŭradawyja, sudowyja i inšyja pawinny prymać: skarhi, prośby i roznyja wyjaśnieńni, na piśmie i wusna, **pabiełarusku**. Dy nia tolki pawinny prymać, ale abawiazany: adkazywać, pawiedamlać i wyjaśniać na hetkija zwaroty, na piśmie i wusna, tak-ža **pabiełarusku**. Słowam, čynoŭniki na biełaruskich ziemlach musiać umieć pabiełarusku z ludźmi spraŭlacca.

Biazsumliŭna, što Druja, Brasłaŭskaha paw., znachodzicca na terytoryi, jakuju abymaje wyšejskazany zakon, i što čynoŭniki Drujskaj wołaści abawiazany hetamu zakonu padlahać. Tymčasam u Drujskaj wołaści adkryta nie pryznajuć hetaha polskaha dziaržaŭnaha zakonu. Kab nie ha-

Dr. Stanisłaŭ i dr. Jadwiha Hrynkiewičy.

Trachoma

(Ehipskaje zapaleńnie wočaŭ.)

Trachoma heta adna z dawoli častych pryčynaŭ ślepaty. Chacia henaja chwaroba mocna raspaŭsiudžanaja, paznać jaje niezaŭsiody lohka, prynamsia pačatna.

Pačynajecca trachoma na sklizistych pawałokach wiekaŭ. I dziela taho, kab paznać chwarobu, treba spodniaje wieka adciahnuć uniz a wierchniaje adwiarnuć uwierch. Sklizistyja pawałoki wiekaŭ ludziej zdarowych hładkija, rožawyja. U ludziej z trachomaju jany čyrwonyja i byccam *pasypanyja ziarniatkami prasianoje kašy*.

Chwory pačuwaje tady, što jahonyja wieki byccam pasypanyja spadyspodu niečym ćwiordym, byccam piaskom. Uwiečary wieki ŭ takich ludziej ciažkija, samyja apadajuć uniz, ranicaju z nočy jany mocna sklejanyja hnojam. Wočy čyrwonyja, asabliwa na wietry ci pry pyle.

Z hetym ludzi mohuć chadzić paru hadoŭ, nat' kali i nia lekujucca, jano mo krychu i niamiła, naš čaławiek znoŭ nie taki ŭžo rupliwy, kab chutčej da dochtara, kali jamu niešta zabalić, a dziakuj Bohu pačatna chwaroba henaja nia škodzić na zrok.

Adnak pawolna chwaroba narastaje. Wočy što-raz bolš balać, pačynajuć biazupynna z ich ciačy ślozy, ranicaju zusim niemahčyma ich raspluščyć, chwory nia moža hladzieć na światło. Heta pakazwaje, što trachoma abo ŭžo pierajšła abo chutka piarojdzie na wočnaje jabłyka.

U čaławieka zdarowaha hładkija sklizistyja pawałoki wiekaŭ ačyščajuć woka ad pyłu, wieki-ž samyja baroniać woka ad lišnia mocnaha światła. Pry trachomie wieki, majučy na sabie poŭna ziarniatak, robiacca šurpatymi, a pacirajučy wočnaje jabłyka wyklikajuć na jom zapaleńnie, jano čyrwanieje. Woka robicca tady chworym, nasampierš pačynaje chwareć sklizistaja pawałoka wočnaha jabłyka tam, dzie najbolš abciraje jaho wieka, a značycca najbolš pad wierchniaju wiekaju, dziela taho, što tam najchutčej pačynajecca chwaroba. Chwaroba pierachodzić na rahawicu i henaja prazrystaja bałonka mutnieje, „raście bialmo.“ Taki čaławiek zašmat nia budzie bačyć, najbolš, kali zmoža adrožnić światło ad ciemry.

I tolki heny mament prymušaje najčaściej źwiarnucca zachwareŭšaha da dochtara, značycca tady, kali nia šmat užo možna zrabić, kab adratawać zrok.

Trachoma nadta zaraznaja. Lepš lekawać jaje ad samaha pačatku, a najlepš jašče nie chwareć na jaje.

Trachoma wyklikajecca asabliwaju bakteryjaju, što siadzić u materyi (hnoi na wiekach), abo i ŭ ślazach. Dyk čaławiek moža zarazicca chwarobaju, kali wymyjecca ŭ adnoj miscy z chworym, kali budzie karystacca adnym z im ručnikom, chustačkaju (nasatkaju), kali spacimie na paścieli chworaha, nasicimie jahonyja akulary.

Aprača henaha zaražeńnia, trachoma raspaŭsiudžywajecca cieraz pył i hraź.

Kab spynić mahčymaść zaražeńnia, dyk značycca treba nakirawać chworaha da dochtara, a druhoje — treba, kab nichto nie karystaŭsia pryładami chworaha, jahonym ručnikom, paściellu i h. d. Kab pył byŭ mienš niebiaśpiečnym, treba zamiatać izbu mokraju hanučkaju, abo pierad zamiatańniem pasypać izbu mokrym piaskom ci piławieńniem.

Usie ŭ chacie chaj myjuć jaknajčaściej ruki i nikoli nie chapajucca za wočy rukami, asabliwa-ž rukami papeckanymi. Ručniki, chuścia chworaha najlepš myć asobna i dobra ŭsieńka sparyć haračaju wadoju.

Jak užo było kazana, śledamki trachomy nadta ciažkija. Kali čaławiek i nie aślepnie, dyk chwaroba pakidaje na wiekach bolšyja ci mienšyja rubcy. Rubcy henyja ściahiwajuć wieki, robiacca jany toŭstymi, apuskajucca ŭniz. Hetki čaławiek wyhladaje zaŭsiody na sonnaha. Wiejałki z wiekam prysoŭwajucca da wočnaha jabłyka i abcirajučy jaho wyklikajuć bol. Heta prymušaje rabić aparacyju, dziela taho, što adno wyrywańnie wiejałak nie nadoŭha pamahaje.

Jašče budzie horš, kali, dziakujučy mocnym rubcam, wieka nia moža zakryć woka i pawałoka sklizistaja wočnaha jabłyka wysychaje. Taki čaławiek nijakaha ratunku nia maje i raniej ci paźniej astaniecca ślapcom.

waryć na ŭźwiej wiecier, padajom dakumentalny fakt. Woś jon:

Kopija

m. Druja dnia 7 stycznia 1935 roku.

Zarząd Gminny w Drui
pow. brasławski
Nr. T. 27.

Do
Koła Białoruskiego Instytutu
Gospodarki i Kultury
w Szalcinach.

Podanie tamt. Koła, które wpłynęło w dniu 21 grudnia 1934 r. Zarząd Gminny nie przyjmuje do wiadomości, ponieważ zostało złożone w języku niepaństwowym.

Sekretarz (—) D. Pistań.
Wójt (—) M. Świderski.

Hurtok B.I.H.iK. źwiarnuŭsia da Drujskaj wałasnoj rady, piśmom z dnia 2.XII.34 h., **pabiełarusku**.

Padajučy heta da publičnaha wiedama, spadziajomsia, što adpawiednyja ŭłady paturbujucca pawučyć wałasnych čynoŭnikaŭ u Drui, kab jany nie łamali zakonaŭ, jakija dajuć prawa biełaruskaj mowie.

p.

BIEŁARUSKAJA CHRONIKA

U sprawie arhanizacyi biełaruskaha katalickaha žyćcia. Biełarusy-kataliki ŭ Wilni, taksama, jak wa ŭsim kraju, žywuć relihijnym žyćciom, z tej rožnicaj, što wilenskija biełarusy-kataliki majuć choć nawuki ŭ kaściele ŭ rodnaj mowie, a na prawincyi i hetaha niama.

Biełarusy-kataliki ŭ Wilni majuć prypynišča pry litoŭcach — kožnuju niadzielu i ŭ świata ŭ litoŭskim kaściele św. Mikałaja Ks. Ad. Stankiewič a 10 hadzinie prawić dla biełarusaŭ św. Imšu i paśla Imšy haworyć pryhoža, wielmi hłybokija pa dumcy, nawuki. Hetak apiakujecca wilenskimi biełarusami-katalikami Ks. Ad. Stankiewič užo bolš 10 hadoŭ. Na biełaruskaje nabaženstwa ŭ kaściele św. Mikałaja stała prychodzić dawoli wialikaja hramada ludziej. Hetaja hramada, jašče letaś, zarhanizawała swoj kaścielny kamitet, jaki rupiŭsia ab kaścielnym chory i ahułam ab haspadarčych kaścielnych patrebach. Siolet a 20 h. m. adbyŭsia hadawy schod hetaha biełaruskaha kaścielnaha kamitetu, jaki, miž inšymi sprawami, pastanawiŭ prystupić da arhanizacyi relihijnaha žyćcia biełarusaŭ-katalikoŭ u formie asobnaj parafii. Pry hetym, kamitet prasiŭ Ks. Ad. Stankiewiča i dalej być dušpastyram wilenskich biełarusaŭ-katalikoŭ.

Takim woś paradkam arhanizujecca biełaruskaja katalickaja parafija ŭ Wilni.

U sprawie čyścini bieł. mowy. 16 h. m. adbyłasia pieršaja, prywatnaja, narada biełarusaŭ, zainteresawanych u pracy dziela ačyščeńnia biełaruskaj mowy ad čužackich upływaŭ. Nastupnaja narada maje adbycca 2-ha lutaha.

Jubilej biełaruskaha teatru. Sioleta minaje 25 hadoŭ ad pieršaha biełaruskaha pradstaŭleńnia ŭ Wilni. Dziela hetaha, z inicyjatywy Fr. Alachnowiča, paŭstała adumysnaja kamisija, jakaja maje zładzić 24 lutaha sioleta ŭračystuju akademiju i spektakl.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Wybary ŭ Sojm i Senat. Polskaja presa padaje čutki: sučasny Sojm i Senat končać swaju kadencyju pryniaŭšy budžet i konstytucyju. Prezydent abwieścić, pryniatuju Sojmam i Senatam, konstytucyju, wydaść dekretam wybarnuju ardynacyju i wyznačyć nowyja wybary. Prad wybarami maje być wydany nowy presawy zakon Wybary adbuducca ŭletku.

Sud za zabojstwa min. Pierackaha. Ministr sprawiadliwaści Michałoŭski zajawiŭ, u sojmawaj dyskusii, što min. Pierackaha zabiła OUN (Orhanizacyja Ukrainskich Nacyjanalistaŭ). Zabojcu nie zławili, ale ŭ turmie siadziać jaho supolniki. Niezadoŭha, kazaŭ ministr, budzie sud, jaki dakładna raźjaśnić hetaje zabojstwa. Cikawa!..

Polskija endeki wadziacca za Biełarusaŭ i Ukraincaŭ. Staŭby polskaj endecyi St. Hrabski z St Hłombinskim zawadzilisia za Biełarusaŭ i Ukraincaŭ. Adzin kaža, što endecyi treba pryznać „Rusinów" i supolna wystupać prociŭ Žydoŭ, a druhi ćwierdzić, što treba da Žydoŭ adnosicca pozytyŭna.

Likwidacyja BB? Polskaja apazycyjnaja presa pieradaje čutki, što partyja B.B. maje być skasawana; na wybary pojduć regionalnyja hrupy hetaj partyi, kožnaja paasobku i z inšym kličam.

Z ZAHRANICY.

Liha Narodaŭ i Niamieččyna. Wiedajem, što Niamieččyna z Lihi Narodaŭ wystupiła. Paśla hetaha i ŭ Lizie Narodaŭ mała astałosia što rabić, bo palityčnaja baraćba z Niamieččynaj taksama wybrałasia z Lihi i Liha pačała puściec dy hłochnuć. Ciapier Anhlija starajecca, kab Niamieččyna wiarnułasia ŭ Lihu.

Niamieččyna pakryłasia radaściaj z pieramohi hałasawańnia ŭ Saary. Cełuju hadzinu, z hetaj pryčyny, zwanili ŭsie zwany ŭ Niamieččynie, byli wywiešany dziaržaŭnyja ściahi, biskupy nakazali duchawienstwu adprawić, na hetu intencyju, bahasłužeńnie

Francyja, šukajučy zbližeńnia z Niamieččynaj, — nie papuskajučy swajho ničoha, — zdaloku trymajecca ad Sawietaŭ, ale i nie adpichaje ich ad siabie, trymajučy hetak balšawikoŭ pry sabie na pastrach Niamieččynie.

Čechasławaččyna ŭściaž, u zahraničnaj palitycy, trymajecca Francyi. Niadaŭnaje jašče pryznańnie Čechasławaččynaj Sawietaŭ taksama było ŭpływam francuskaj palityki. Ale ciapier nakirawałasia na Zachad francuskaja palityka, — dyk astyli sympatyi da balšawikoŭ i z boku Čechasławaččyny.

Likwidacyja partyjaŭ u Łatwii. Rasparadžeńniem ministra ŭnutranych spraŭ zahadana źlikwidawać usie palityčnyja partyi ŭ Łatwii. Heta aficyjalny zahad, a faktyčna ŭžo ŭsie partyi źlikwidawany žorstkaj dyktaturaj łatyskaha nacyjanalizmu.

Balšawiki pradali čyhunku, što jdzie praz Mandžuryju. Užo akančalna Sawiety dahawarylisia z Japonijaj adnosna čyhunki, što jdzie praz Mandžuryju; balšawiki pradali hetu čyhunku Japonii za 140 miljonaŭ japonskich jen.

Z KRAJU.

Zabojstwa. U lasoch dwara Haradziec, kala Hłybokaha, laśnik znajšoŭ trupa mužčyny, schawanaha ŭ łomie. Ślady saniej dawiali da miejsca zabojstwa. Śledztwa wykryła i zabojcaŭ. 6 asob aryštawana.

Z WILNI.

Pamior D-r C. Šabad. U paniadziełak 20 h. m. pamior wiedamy žydoŭski dziejač, Dr. C. Šabad. Niabožčyk mnoha pracawaŭ dla sprawy žydoŭskaj na niwie kulturnaj, hramadzkaj i palityčnaj. D-r Šabad pracawaŭ i ŭ Bloku Nacyjanalnych Mienšaściaŭ u Polščy—na wilenskim hruncie z biełarusami i litoŭcami.

Biezraboćcie ŭściaž raście. Ciapier Wilnia maje zarejestrawanych biezrabotnych 6125 asob.

Michalewič—pop. Pa Wilni chodziać čutki: — byŭšy dyrektar Wil. Bieł. Himnazii hram. Michalewič maje być paświačany na prawasłaŭnaha świaščeńnika.

Kali heta praŭda, dyk možna spadziawacca, što hram. Astroŭski budzie ŭ Wilni archirejam.

Paśla plebiscytu ŭ Saary — palityka na Uschodzie.

Niamieččyna, swaju palityku na zachodzie Eŭropy, na ciapier, dawiała da apošniaha punktu: —Saara, ad 3 siol. sakawika, budzie ŭ hranicach Niamieččyny. Ciapier niamieckaja palityka ŭsim swaim impetam zwaročwajecca na ŭschod.

Paśla zaklučeńnia miž Polščaj i Niamieččynaj dahaworu ab uzajemnym nienapadańni, jasna pakazałasia, što niamieckaja palityka na ŭschod maje prabiracca prybałtyckim pabiarežžam i praz Aŭstryju da Čornaha mora na Ukrainu.

Nia lohka prabracca niemcam na abšary SSRR., bo šlachi ekspansii mocna zaharodžany — Litwa, Łatwija, Estonija z adnaho boku i hwarancyja niezaležnaści Aŭstryi, z jaje niezaležnickaj palitykaj, z druhoha boku

Dziela hetaha woś Francyja starajecca, a Sawiety joj asystujuć, kab stwaryć, kala bałtyckaha bloku (Litwa, Łatwija, Estonija), h. zw. uschodzi pakt—uciahwajučy ŭ jaho Niamieččynu i Polšč, — jaki-b hwarantawaŭ na ŭschodzie Eŭropy supakoj i suwerennaść isnujučych dziaržaŭ. Heta z adnaho boku, a z druhoha boku tworycca tak-ža, zachadami Francyi, pry asyście Sawietaŭ, blok dziaržaŭ na zachodzie Eŭropy, jaki maje, pradusim, hwarantawać niezaležnaść Aŭstryi, nawat choć-by i suproć woli samoj Aŭstryi.

Woś hałoŭnyja punkty ciapierašniaj miždziaržaŭnaj palityki wialikich dziaržaŭ Eŭropy.

Kamunistyja sudziacca — sud nad Zinowjewym, Kamieniewym i 17 tawaryšami.

Zabojstwa Kirowa i masawyja aryšty, paśla rastreły i ssyłki pakazali prad usim świetam, što miž kamunistymi, u Sawietach, adbywajecca śmiarotnaja hryźnia: hryzucca miž saboju, da śmierci, pawadyry i wučyciali kamunizmu ŭ Sawietach. Paśla zasudu na śmierč u pracesie „Leninhradzkaha Centru," adbyŭsia praces „Maskoŭskaha Centru." Sudzili Zinowjewa, Kamieniewa i 17 ichnich tawaryšoŭ. Akt abwinawačańnia ćwierdzić, što adnačasna, z paŭstańniem kontrewalucyjnaha „Leninhradzkaha Centru," paŭstaŭ taki-ž „Maskoŭski Centr," na čale z Zinowjewym i Kamieniewym.

Padsudnyja na pracesie zajaŭlali, što kolektywizacyju, jakuju ciapier prawodziać u Sawietach, jany ŭważajuć za warjactwa. Na sudzie abwinawačanyja pryznalisia da winy i niekatoryja kajalisia.

Sud — wajennaja kalehija — zasudziŭ: Zinowjewa na 10 hadoŭ, Kamieniewa na 5 hadoŭ i 17 druhich abwinawačanych na niekalkihodnija kary katarhi.

Hety praces, jašče raz, pakazaŭ što kamunizm pačynaje razwaliwacca znutra — zhniŭ sam u sabie.

Anhielskaja petycyja ŭ Lizie Narodaŭ damahajecca wysyłki śledčaj kamisii ŭ Polšč.

Anhielskija parlamentarysty wysłali 20.XII.1934 h. petycyju ŭ Lihu Narodaŭ u sprawie pałažeńnia Ukraincaŭ pad Polščaj.

Pałažeńnie Ukraincaŭ, ahułam biaručy, nia lepšaje ad našaha, biełaruskaha, pałažeńnia; wioska ŭkrainskaja ciomnaja, asabliwa na Wałyni, tak, što ŭ masie ŭkrainskaje nasialeńnie — ŭ sensie kulturnaj wyšyni, takoje, jak i našaje, biełaruskaje.

Petycyju padpisała 20 asob — ciapierašnija i byŭšyja pasły anhielskaha parlamantu. U petycyi zwaročwajuć uwahu, što ŭ Polščy źmianiajuć konstytucyju; kali jana budzie abawiazywać, Ukraincy nia buduć mieć u Senacie pradstaŭnikoŭ. Praŭda, min. Bek zajawiŭ u Ženiewie 13 wieraśnia 1934 h., što intaresy mienšaściaŭ astanucca pad acharonaj asnaŭnych zakonaŭ Polščy, adnak lik faktaŭ—haworycca ŭ petycyi — dakazwaje, što ŭ Polščy henych zakonaŭ nie prytrymliwajuć i nie šanujuć. Dziela hetaha petycyja damahajecca, kab Liha Narodaŭ zahadała raźśledawać hetu sprawu, abo wysyłajučy specyjalnuju kamisiju, abo jakim inšym sposabam.

Piśmy z wioski.

„Adzin łapać, druhi bot, a ja šlachcic—daliboh!"

Kimiany, Šumskaj wołaści, Wil.-Trockaha paw.

„Naš Piatruk raz z polskim panam ŭ hutarku ŭwiazaŭsia" —
„Palakom jon pakazacca pierad im staraŭsia"...

Kala nas hetak jość zaŭsiody. Kožny, krychu bahaciejšy, sielanin, jaki maje choć adzin bot, starajecca ad biadniejšych susiedziaŭ adrožnicca i pačynaje „cokać" dy „pšykać." A poŭhałodny sielanin, jak spatkaje lepš ad siabie adzietaha i lepš nakormlenaha čałavieka, adrazu pačynaje hutarku tolki pa kaścielna-kazionnamu — papolsku. A polščyna heta ŭ jaho wychodzić, jak adna niaŭmysnaja naśmieška z polskaj mowy.

Heta ŭsio świedčyć ab niawolnickaj psychicy našych ludziej. I dziŭna, što światlejšyja ludzi dy nie starajucca, kab hetych biednych ludziej wyzwalić z hetaj, nikomu nie patrebnaj, duchowaj niawoli.

Chryścijanstwa dla ludzkaści jość cennym i tym, što siarod dzikawatych narodaŭ šyryła i šyryć wysokuju praŭdu Božuju i padymaje narody na wyšejšy stupień ludzkoj hodnaści. U nas zusim nia tak: u nas, siarod biełarusaŭ, chryścijanstwa dla ludziej čužoje — katalicki kaścioł u nas nazywajuć ludzi „polskaj wieraj," — narod naš maje swaju, nie aficyjalnuju, wieru — zababony i čary. Pradstaŭniki polskaha ŭ nas kaściołu — ksiandzy-palaki, ab hetym, što ŭ narod nia šyrycca i nia hłybicca chryścijanstwa, najmienš dbajuć. Jany hałowiacca, kab našyja ludzi byli palakami.

Hetak i ŭ škole: biełaruskich dziaciej wučać ad samaha pačatku papolsku. Dzieci pachadziŭšy 4 hady ŭ polskuju školu nia ŭmiejuć čytać, a prasiadzieŭšy 3 hady ŭ IV addziele, bo VII addziałowych školaŭ nia ŭsiudy jość, hetkimi „hramaciejami" wychodziać u świet. Paśla hetkaj nawuki pačynajecca paŭtornaja biazhramatnaść.

Hetyja i padobnyja abstawiny i wytwarajuć u nas typaŭ — „Piatrukoŭ" z adnym łapciam, druhim botam.

Braty! Šukajma praświety—šlachu da lepšaj doli Nia majem škoły ŭ rodnaj mowie, dyk biaremsia za pazaškolnuju aświetu: čytajma swaje, biełaruskija, knižki i hazety, arhanizujmasia ŭ swaje rodnyja, biełaruskija, kulturna-praświetnyja arhanizacyi i hetak idziem da lepšaj doli!

S—i č.

„Культурнікі" Т. Б. Ш.

Беласток. Нашыя, беластоцкія „культурнікі" Т.Б.Ш. ўжо сядзяць ціха і не праяўляюць ніякай дзейнасьці. Праўду кажучы, ад гэтага беларускай справе шкоды няма, бо работа і дзейнасьць гэных „культурнікаў" сама ў сабе, для справы беларускай, шкодныя. Гавару тут аб „культурніках" Т.Б.Ш. апошніх часоў, калі яны апанаваўшы Т.Б.Ш. пачалі заводзіць сваю „культуру."

Гэтыя людзі нарабілі ня мала шкоды беларускай справе: яны разьбівалі тутэйшых беларусаў і гэтым памаглі ўсходу і заходу.

Трэба было-б, каб у нас — у Беластоку—заснаваўся гуртокБеларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

Іс—і ч.

№3(14). СТУДЭНСКАЯ ТРЫБУНА 27.I.35.

БАЦЬКАЎШЧЫНА, НАВУКА, ЦНОТА.

Гэткія важкія словы выпісаны на фронтоне галоўных дзьвярэй галоўнага будынку віленскага ўнівэрсытэту. Гістарычныя, традыцыйныя словы! Яны прысьвячалі ўнівэрсытэту і студэнскай моладзі дайней, у пачатку 19-га стагодзьдзя, калі тварыліся гурткі гэтай моладзі — філёматаў, філярэтаў і прамяністых. Яны прысьвячаюць і цяпер, ад ускрашэньня ўнівэрсытэту да сяньня. Яны павінны прысьвячаць і пазьней і заўсёды, як доўга будуць існаваць унівэрсытэты, як доўга будзе студэнская моладзь — сапраўды моладзьдзю студэнскай.

І сапраўды, унівэрсытэт, — у эўропэйскім сэнсе гэтага слова, — пакліканы даваць навуку, зглыбляць яе, і ўзгадовываць у цноце студэнскую моладзь, каб яна — узброеная ў навуку і цноту — магла добра служыць Бацькаўшчыне, а праз яе — чалавецтву.

Трэба застанавіцца над гэтым асабліва нашай беларускай студэнскай моладзі — каб пазбавіцца дылетантызму ў навуцы, дэкадэнтызму — у этыцы, каб годна выпаўняць заданьні перад Народам, Бацькаўшчынай і чалавецтвам. Трэба! Бо-ж жніво ў нас — у паруўсьцяж ідучага ўперад вызваленча-адраджэнскага беларускага руху — вялікае, а працаўнікоў — мала!

Латвійскі унівэрсытэт і беларускае студэнства.

Заснаваны латвійскі ўнівэрсытэт у 1919 г. у Рызе. Цяжкую барацьбу за існаваньне і далейшае разьвіцьцё прышлося вясьці ў неспакойны посьлеваенны час. Аднак вялікая любоў да бацькаўшчыны, вера ў свой народ нязначнага ліку шчырых латвійскіх патрыётаў перамаглі ўсе сустраканыя на шляху парашкоды і далі народу магчымасьць здабыцьця вышэйшае асьветы.

Зараз пры ўнівэрсытэце існуюць такія факультэты і аддзелы:

1) Архітэктурны факультэт; 2) факультэт філёлёгіі і філёзофіі з: a) філ. балтаў, b) клясычнай філ., c) германскай філ., d) романскай філ., e) гісторыі, f) філёзофіі, і g) пэдагогічным аддзеламі; 3) інжынерны фак. з культуртэхнічным аддзелам; 4) хімічны фак., з фармацэутскім аддзелам; 5) аграномічны фак., з аддзелам лесаводзтва; 6) матэматычны і прыродазнаўчы факультэты, з матэматычным і прыродазнаўчым аддзеламі; 7) мэханічны фак.; 8) мэдыцынскі фак. з зубалячэбным аддзелам; 9) эканамічны і юрыдычны фак., з аддзеламі эканамічным і права; 10) тэолёгічны фак.; 11) вэтэрынар-мэдыцынскі фак.

Іматрыкулявана пры ўнівэрсытэце 8587 студэнтаў, з якіх 6083 (70,8 проц.) мужчын і 2504 (29,2 проц.) жанчын. З іх латышоў 7052 (82,1 проц.), іншых нац. 1535 (17,9 проц.).

Найбольшы лік студэнтаў на эканамічным і юрыдычным фак., найменшы—на вэтэрынармэдыцыне.

Час студыяў — пераважна 4 5 год, але частка прабывае на ўнівэрсытэце нават... 30 і больш сэмэстраў.

Большасьць студэнства арганізавана. За мінулы год рэгістраваны 103 арганізацыі.

Латыскае студэнства стаіць за рэалізацыю ідэі супрацоўніцтва балтыцкіх дзяржаў — Латвіі, Літвы, Эстоніі і Фінляндыі і таму разам з студэнствам вышэйуспомненых дзяржаў аперадзілі нават афіцыяльныя інстанцыі, стварыўшы SELL—арганізацыю, каторая ў гэтым сэмэстры мае аглянуцца на 12 год свайго існаваньня.

У распараджэньні л. у. знаходзяцца ў значным ліку навуковыя інстытуты, кабінэты, лябараторыі, клінікі, музэі, калекцыі, гаспадаркі для практычных прац, экспэрымэнтальныя станцыі.

Пры ўнів. ёсьць бібліатэкі і чытальні: цэнтральная бібл. з 112.859 т.

Лекцыі на ўнівэрсытэце чытаюцца ў латыскай мове і нікаторыя прадметы ў нямецкай, расейскай, французкай і ангельскай мовах. Зараз пры ўнівэрсытэце налічаецца 384 навуковых сіл.

Плата за навуку 200 латаў у год.

Беларускае студэнства пры л. у. знаходзіцца ў вельмі нязначным ліку: 4 матурысты Дзьвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі і столькі-ж —атрымаўшых сярэднюю адукацыю за мурамі беларускае гімназіі. Прычыны таго, што наша моладзь у Латвіі яшчэ да гэтага часу так мала ймкнецца да вышэйшае асьветы — досыць важныя і часамі апраўдываючыя гэту моладзь, а іменна — што апрача благога матар'яльнага становішча беларусоў, паступленьне абмяжовываюць і срогія экзаміны.— Кожны, жадаючы паступіць у л. у., павінен здаць экзаміны з латыскае мовы вусна і пісьменна, нямецкую мову, і яшчэ адзін — у залежнасьці ад выбару факультэту. Апрача названых кантрольных, існуюць экзаміны конкурсныя, бо лічба жадаючых паступіць ў унівэрсытэт у некалькі разоў правышае лічбу вольных мейсц. Таму ня дзіўна, што цяжка беларусам прэтэндаваць на вытрыманьне конкурсу з латыскай мовы з латышамі, калі апрача тэорэтычнае веды зьвяртаецца увага нават на выгавар. Дзеля гэтага наша моладзь і—без патрэбы!—баіцца прабаваць свае сілы.

Беларускае студэнства пераважна студыюе навукі прыродазнаўчыя і матэматыку; — адзін на філёлёгіі (клясычнай), адна—права і адзін — эканамічныя навукі.

Беларускім дзяўчагам у Латвіі дарэчы было-б закінуць адсталасьць ад хлапцоў у сэнсе імкненьня да вышэйшае адукацыі, бо дагэтуль маем на ўнівэрсытэце толькі адну студэнтку.

Як відаць з вышэйпаданых датаў, лік беларускіх студ. у л. у. невялікі, аднак адважываюцца думаць і спадзявацца аб адчыненьні сваей студэнскае арганізацыі, для чаго неабходна 15 сяброў. Нехапаючыя падпісы далі, спрыяючыя аб'яднаньню беларускіх студэнтаў, студэнты латышы і такім чынам вясмой 1934 г. быў выпрацаваны і пададзены на зацьверджаньне статут беларускае студэнскае арганізацыі „Alboruthenica".

Доўга чакалі на гэтае зацьверджаньне, і ўрэшце, у канцы першага сэмэстру г. акад. году, прышлося атрымаць адмову, дзеля вялікага працэнту падпісаўшыхся студэнтаў-латышоў, і двух беларусаў, што належаць да латыскай карпарацыі. — І усёж, посьле першае няўдачы, нашае студэнства ня страціла веры й надзеі. Зараз маем зарганізавацца іншым шляхам — заклаўшы гурток беларускіх студэнтаў, дзе патрэбна толькі 5 (пяць) сяброў. Зразумела, такое аб'еднаньне не мае меншае значэньне рэпрэзэнтацыйнае пры ўнівэрсытэце, менш правоў, аднак да часу адчыненьня праектаванае арганізацыі пастараецца гуртаваць нашае беларускае студэнства і па магчымасьці вясьці адраджэнскую беларускую працу.

Рыга, студзень 1935 г. *В. С.*

Езуіцка-польская палітыка.

Калі справа злучэньня праваслаўных беларусаў і ўкраінцаў з каталіцкай царквой зьвярнула на сябе большую ўвагу Рыму, закладаецца ў Дубне (на Валыні) духоўная сэмінарыя для будучых уніяцкіх сьвяшчэньнікаў. Фінансуе гэту інстытуцыю сам Папа, а безпасярэднімі яе кіраўнікамі зьяўляюцца айцы езуіты. Задачай гэтай сэмінарыі ёсьць: даць беларускіх сьвяшчэньнікаў беларусам, а ўкраінскіх — украінцам. Аб паляках няма чаго гаварыць, бо праваслаўных палякаў так, як і зусім няма.

Прыхільнікаў уніі на Беларусі гэта зьявішча вельмі цешыла. Тымчасам айцы езуіты, каторым нат ворагі іх прызнаюць жалезную лёгіку і развагу, у гэтым выпадку, захісталіся, ды што горш,—сталіся падобнымі да маскоўскіх і польскіх кіраўнікоў рэлігійнага жыцьця на Беларусі, якія, як ведама, дзень і ноч сочаць, каб беларуская мова і беларускі дух не пранікліў сьвятыню.

Перш наперш айцы езуіты агранічылі прыняцьце ўкраінскіх кандыдатаў з Галіцыі, дзе амаль усе ёсьць уніяты і дзе сьведамасьць украінская найбольш дасьпелая, а палякаў, каторыя пераважна не згаджаюцца з правядзеньнем уніі, паводле плянаў Рыму, прыймаюць з усей Польшчы. Абсольвэнтаў сэмінарыі беларусаў высылаюць працаваць на Украіну, бо для іх не даюць мейсца на Беларусі польскія каталіцкія біскупы, якім таксама падпарадкаваныя ўніяцкія прыходы. Айцы езуіты ў гэтым выпадку аказваюцца мягкімі і паслушнымі, а маглі-б у імя справядлівасьці паступіць цьвярдзей і нат' абапёрціся аб Рым.

Апошняя найменшая, але надта характэрная справа: як прыяжджаюць у сэмінарыю польскія каталіцкія біскупы, ці на'т толькі ксяндзы, тады ўсім сьвята — гасьцей прыймаюць honeste, — а як прыедзе біскуп Чарнэцкі,—тады ўсе пры працы, ніхто ня мае доступу да ўніяцкага візытатара. З гэтага відаць „шчырае" аблічча айцоў езуітаў.

Чымжа яны розьняцца ад маскоўскіх і польскіх душпастыраў? — Праўда, некалькі айцоў езуітаў гавораць пабеларуску і выдаюць рэлігійны часапіс у беларускай мове „*Да злучэньня*",—гэтым-бы толькі і розьніліся ад маскоўскага і польскага духавенства на нашых землях. Зьмест-жа часапісу „Да злучэньня" такі, што каб не КАП, (Каталіцкае Прэсавае Агенства) то рэдактар пусьціў-бы яго з аднэй Эванэліяй, бо сам ён аб ніякіх справах беларускіх ня ведае і ня піша, ці мо' ведае, але пісаць ня хоча.

Узяўшы пад увагу цяперашні стан уніі на Беларусі, уплыў на яе польскага шовіністычнага духавенства, а таксама двуліцовую палітыку айцоў езуітаў, як безпасярэдных кіраўнікоў уніі, беларускае студэнства, а так-жа і ўся інтэлігэнцыя павінны павясьці апазыцыйную акцыю супроць сяняшніх кіраўнікоў уніі.

Дамагацца-ж будзем наступнага: 1) уніяцкія прыходы павінны быць незалежныя ад польскага каталіцкага духавенства, 2) беларускія сьвяшчэньнікі павінны працаваць на Беларусі; 3) місіі павінны вясьціся выключна ў беларускай мове, таксама ў царкве павінна быць ужываная толькі мова беларуская.

Студэнт-Уніят.

Хроніка.

—25.XI 1934 г. у Аб'еднаньні Беларускіх Студэнскіх Арганізацыяў (АБСА) — у Празе (Чэхаславаччына) адбылося рэфэрэндум. Схвалена дзейнасьць за мінулы год. Выбраны новы ўрад у складзе: Алесь Вітушка — старшыня, Т. Грыб — віцэ-старшыня, Я. Ермачэнка—загранічны рэфэрэнт, Алесь Калоша—пісар і скарбнік, А. Шкут — вольны сябра і ўпоўнамочаны прадстаўнік АБСА на Нямеччыну, Д. Касановіч — вольны сябра і ўпоўнамочаны прадстаўнік АБСА на Бэльгію. У Рэвізыйную Камісію ўвашлі: Мікола Манастырскі, П. Астапкевіч, К. Буська. У склад Суду Гонару ўвайшлі: А. Шах, Т. Клаўсуць і М. Маскалік.

Прыгатаўляецца Урад АБСА да конфэрэнцыі CIE (Міжнароднай Студэнскай Конфэдэрацыі), якая сёлета, у жніўні месяцы, адбудзецца ў Чэхаславаччыне; прыгатаўляецца дзеля гэтага і Бюлетэнь АБСА, у францускай мове.

— У канцы мінулага 1934 году ўтварыліся ў Бел. Студ. Саюзе ў Вільні такія сэкцыі: 1) культурна-прасьветная, 2) таварыская, 3) харавая і 4) выдавецкая.

— 19.I.35 г. у Б.С.С. быў прачытаны кал. В. Склубоўскім (кіраўніком культур.-прасьв. сэкцыі) рэфэрат на тэму „Нацыяналізм". Пасьля рэфэрату адбылася жывая дыскусыя.

— 26.I.35 г. у памешканьні Бел. Інст. Гасп. і Культ. (Вільня, Завальная 1) адбудзецца суботнік, ладжаны Бел. Студ. Саюзам. У праграме: 1) рэфэрат абс. мэдыцыны кал. Я. Малецкага на тэму: „Аб новатворах" („De neaplasmatibus"), 2) Скокі, гульні і песьні. Пачатак а гадз. 18-й. Уступ для студэнтаў і запрошаных гасьцей.

— Др. Я. Станкевіч пасьля сьвяточнага перарыву пачаў лекцыі з беларусазнаўства (лектарат) пры У.С.Б.

— Юры Кепель, ведамы спартовец—беларус, студэнт віленскага унівэрсытэту, на гонках на нартах у Закапаным надовячы зламаў нагу і цяпер лечыцца там у шпіталі.

— „Родны Край" (№ 2, сёлета) падае, што ўлады віл. унівэрсытэту зацьвердзілі статут новай беларускай студэнскай арганізацыі п. н. „Бел. студэнцкае Таварыства імя Ф. Скарыны" і што арганізацыя гэта паўстала па ініцыятыве сяброў б. корпорацыі „Скорынія".

Устрымліваемся ад бліжэйшай агаворкі гэтай справы. Скажам толькі, што „новы твар", у новай форме экспозытура бел.-польскай угоды, найнавейшая „варта" скампрамітаваных скарынчыкаў нічога ім не паможа. Беларускае незалежнае студэнства зьдзярэ з іх і „новую" маску!

Наша пошта.

Кал. М. Т. у Львове: Дзякуем за памяць. Правільна кажаце, што Б. С. С. існуе дзеля таго, каб згрупаваць студэнтаў Беларусаў ня толькі па форме, але і зьместу, а ня тых, каторым сьцягам ёсьць інтэрнацыянал, або сьцяг іншых ворагаў беларускага народу.

Б. С. С. ад пачатку свайго існаваньня да сяньня срога трымаецца гэткае думкі і праводзе яе— нешкадуючы на'т „ахвяр"—у жыцьцё. У гэтым яго — панашаму — вялікая гістарычная заслуга і добра зразумелая адраджэнска-вызвольная служба Беларусі.

Кал. В. С. у Рызе: Шчыра дзякуем за артыкул. Як бачыце, зьмяшчаем, крыху скараціўшы. Просім помніць аб нас. Прывітаньне нашае ўсяму бел. студ. у Латвіі!

Ураду АБСА (Прага): Прывітаньне ад нас! Просімо падаць адрасы замежнага бел. студ. — арганізаванага і неарганіз. (пасобных студ.).

Рэдакцыйная Калегія «Студэнскай Трыбуны» ў складзе: А. Дасюкевіч, Я. Малецкі і С. Коўш.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 3. Wydawiec A. Šutewič